*Ігар Чарняўскі,*
*Марыя Цэйтліна*

## Архітэктурна-мастацкія асаблівасці Крэўскага замка

## (па выніках археалагічных даследаванняў)

Крэўскі замак – адно з першых мураваных фартыфікацыйных збудаванняў на тэрыторыі Беларусі, узведзеных у перыяд станаўлення Вялікага Княства Літоўскага з мэтай супрацьстаяння агрэсіўнаму наступу заходнееўрапейскіх рыцараў. Прынцып пабудовы падобных фартэцыяў быў запазычаны ў саміх крыжакоў і надзвычай удала адаптаваны на беларускіх землях для патрэбаў абароны. Матэрыялы даследаванняў замка дазваляюць гаварыць пра выключнае яго значэнне ў гісторыі архітэктуры Беларусі.

Пачатак мэтанакіраванага вывучэння Крэўскага замка прыпадае на 1970 год, калі экспедыцыяй Інстытута гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам М.Ткачова была ўстаноўлена наяўнасць на яго двары культурнага слоя магутнасцю 0,5 – 0,7 м, датаванага XIV–XVI стагоддзямі. Даследчыкам выяўлены рэшткі брукаванага машчэння, якое праходзіла ад уязной брамы ў паўночна-ўсходнім муры да малой вежы, размешчанай у паўднёвым куце замка. Знойдзены фрагменты архітэктурна-дэкаратыўнай і будаўнічай керамікі, якія дазваляюць ахарактарызаваць асобныя дэталі вонкавага і ўнутранага аблічча збудавання.

Даследаванні Крэўскага замка былі прадоўжаны ў 1985 годзе аб`яднанай экспедыцыяй БСНРВА «Белрэстаўрацыя» і Гродзенскага дзяржуніверсітэта, якую ўзначальвалі А.Трусаў і М.Ткачоў. На павышанай паўночна-заходняй частцы двара былі знойдзены рэшткі драўляных жылых і гаспадарчых будынкаў, фрагменты розначасовых кафляў, бытавой керамікі, металічных вырабаў. У ходзе раскопак стала магчымым пацвердзіць меркаванне літоўскіх даследчыкаў аб аднясенні збудавання да XIII стагоддзя.

Асаблівае значэнне ў гісторыі вывучэння Крэўскага замка мае меркаванне адносна жылых функцый паўночнай Княжацкай вежы, выказанае яшчэ ў 1928 годзе М.Шчакаціхіным. Сцверджанне мастацтвазнаўцы падтрымаў М.Ткачоў. Аднак да пэўнага часу заставалася незаўважанай выснова М.Шчакаціхіна пра размяшчэнне ўваходу ў вежу на ўзроўні другога паверха, «так што з зямлі да яго падымаліся па пераносных драбінах, і ўжо адсюль па нутраных усходах можна было пераходзіць з паверха ў паверх».

У ходзе нашых даследаванняў замка ў 1987–1989 гадах на падставе выяўленых знаходак будаўнічай і архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі, некалькіх тысяч фрагментаў унутранай тынкоўкі з фрэскавым роспісам было канчаткова пацверджана меркаванне папярэдніх даследчыкаў адносна жылых функцый Княжацкай вежы. Знойдзеныя на розных узроўнях напластаванняў унутры збудавання рэшткі бытавой і архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі, асколкі артылерыйскіх снарадаў дазваляюць вызначыць два асноўныя этапы яе разбурэння, якія прыпадаюць на другую палову XVII стагоддзя і на перыяд Першай сусветнай вайны.

Пры вывучэнні Княжацкай вежы было ўстаноўлена, што будавалася яна, як і малая паўднёвая вежа, пасля ўзвядзення абарончых муроў без перавязкі з іх муроўкай. У культурных напластаваннях прасочаны сляды пажараў і перабудоў вежы на працягу першага стагоддзя яе існавання. У ходзе аднаго з узнаўленняў збудавання дзесьці на мяжы 20 – 30-х гадоў XV стагоддзя па цэнтры быў узведзены крыжападобны слуп, на які абапіраліся нервюрныя скляпенні, што перакрывалі памяшканні другога і вышэйшых паверхаў. Першапачатковыя перакрыцці паверхаў выконваліся з дошак па брусах, ад якіх у сценах захаваліся прамавугольныя адтуліны. Размяшчэнне ўваходу ў збудаванне з баявой галерэі на ўзроўні трэцяга паверха, знойдзеныя пры раскопках відавочныя сведчанні яе жылых функцый, несумненнае абарончае значэнне ў сістэме замкавай фартыфікацыі дазваляюць аднесці Княжацкую вежу да пабудоў тыпу «данжон». Пры гэтым варта адзна-

чыць, што аднясенне да падобнага тыпу архітэктурных аб`ектаў вежаў «валынскага тыпу» было ў большасці выпадкаў памылковым з прычыны немагчымасці спалучэння ў апошніх жылых і абарончых функцый.

Важным ва ўзнаўленні аб`ёмна-планавай кампазіцыі Крэўскага замка стала выяўленне на адлегласці 15 м у паўднёва-заходнім накірунку ад уваходу на падворку рэшткаў мураванага будынка грамадзянскага прызначэння, пра што сведчаць знойдзеныя ў ім фрагменты бытавой і архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі XIV–XVII стагоддзяў. Будаўнічыя асаблівасці выяўленага збудавання, абарончых муроў і вежаў замка цалкам супадаюць паміж сабой, што сведчыць пра ўзвядзенне іх у блізкім часовым прамежку.

Знойдзеныя пры археалагічных раскопках Княжацкай вежы фрагменты тынкоўкі з роспісам істотна пашыраюць і дапаўняюць уяўленні адносна характару развіцця сярэднявечнага беларускага выяўленчага мастацтва. Атрыманая інфармацыя, перадусім, дазваляе скласці ўяўленне пра тэхніку жывапісу, пра выкарыстаныя матэрыялы, адносна каларыстычнай гамы, якой аддавалі перавагу майстры.

Вывучэнне фрагментаў тынкоўкі з жывапісам дазваляе вылучыць пэўную колькасць знаходак, звязаных з перыядам аздаблення інтэр'ераў вежы неўзабаве пасля завяршэння яе будаўніцтва. Сведчаннем таму ёсць істотнае падабенства тэхналогій муровачнай рошчыны вежы і некаторых фрагментаў тынковак, таніраваных чырвонымі вохрамі. На іх паверхні прасочваюцца ледзь заўважныя цёмна-чырвоныя вохрыстыя палоскі. Рошчыны маюць аднолькавую вапнава-пясчаную аснову з дабаўленнем значнай колькасці моцна здробненай клінкернай цэглы. У параўнанні з вяжучым матэрыялам муроў вежы, напаўняльнік рошчыны тынкоўкі мае больш здробненую кансістэнцыю.

У той жа час неабходна адзначыць, што на большасці фрагментаў жывапіс быў выкананы па іншых грунтах, цалкам у іншай тэхналагічнай традыцыі. Гэта дазваляе

аднесці іх да іншага храналагічнага перыяду ў параўнанні з будаўніцтвам асноўнага аб'ёму вежы. Чарговае аздабленне інтэр'ераў вежы храналагічна супадае з узнаўленнем замка пасля яго разбурэнняў пачатку XV стагоддзя, сляды чаго зафіксаваныя пры археалагічных раскопках у паўночным куце дваравой тэрыторыі.

У адрозненне ад каляровай тынкоўкі ранняга перыяду, у вапнава-пясчаных з нязначнымі дамешкамі сечанай саломы грунтах у вялікіх колькасцях прысутнічаюць кварцавыя субстанцыі, якія сведчаць пра папярэднюю тэрмічную апрацоўку пяску. Магчыма, напаўняльнікам грунту маглі служыць адходы вытворчасці шкла. Вядома, што выкарыстанне кварцавых дамешкаў, папярэдне апрацаваных уздзеяннем высокіх тэмператур, сведчыць пра высокі прафесіяналізм майстроў і іх прадуманы падыход да падбору матэрыялу. Менавіта падвергнуты тэрмічнай апрацоўцы кварцавы пясок надае рошчыне большую трываласць, выкліканую ўтварэннем актыўнага крэмню.

Верагодней, роспісы былі выкананы ў тэхніцы all-secco, г. зн. па сухой тынкоўцы. Перад нанясеннем жывапісных сюжэтаў паверхню сцен добра ўвільгатнялі. Роспіс выконваўся фарбамі, змешанымі з гашанай вапнай. У часе высыхання пафарбовачнага слоя і ўвільготненай тынкоўкі адбываўся той самы працэс карбанізацыі вапны з замацаваннем пігментаў на сцяне, што і пры рабоце all-fresco, па непрасохлай пасля аддзелачных работ тынкоўцы.

Арганічных вяжучых матэрыялаў у складзе жывапіснага слоя не выяўлена. У большасці сваёй ён наносіўся па жывапіснаму грунту. Але некаторыя фарбы ляжаць паверх якога-небудзь іншага пафарбовачнага слоя, часцей – белага. Мастакі карысталіся пераважна мінеральнымі пігментамі.

Пры выкананні роспісаў у вежы Крэўскага замка жывапісцамі выкарыстана дастаткова багатая колеравая палітра. Шырока ўжываліся чырвоныя, чырвона-карычневыя і карычневыя пігменты, якія па свайму складу з'яўляюцца жалезаўтрымліваючымі прыроднымі пігментамі групы вохраў. Карычневы з чырвона-фіялетавымі адцен-

нямі колер утвораны сумессю карычнева-чырвоных вохраў і парашку драўнянага вугалю. На некаторых участках жывапісу ў чыровным колеры прысутнічае дысперсны малінава-чырвоны пігмент, які ўяўляе сабой кінавар. Адзіным зялёным пігментам у даследаваных абразцах жывапісу быў глаўканіт, або так званыя зялёныя землі. Тоўчаны драўняны вугаль, замешаны з вапнавымі бяліламі, прымяняўся ў якасці чорнай фарбы.

Асаблівае месца ў палітры крэўскіх фарбаў займае блакітная, ідэнтыфікаваная ў якасці меднага шкла, блізкага па свайму характару да егіпецкай сіняй. Ужыванне белых, чорных, групы земляных пігментаў у гісторыі беларускага манументальнага жывапісу, як і жывапісу ўвогуле, застаецца нязменным, незалежна ад стылёвых зменаў, тэрытарыяльнай прыналежнасці пэўнага твора. Да выяўлення фрагментаў крэўскіх фрэсак лічылася, што егіпецкая сіняя (меднае шкло), пачынаючы з VII–VIII стагоддзяў, практычна знікла цалкам. Існуе меркаванне гісторыкаў мастацтва, што ўжо ў IX стагоддзі рэцэпт вырабу гэтай фарбы быў забыты зусім. Для візантыйскіх роспісаў, як і для заходнееўрапейскага жывапісу ў XIV– XVI стагоддзях становіцца найбольш тыповым выкарыстанне для перадачы сіняга колеру азурыту.

На мяжы XVII–XVIII стагоддзяў крэўскія роспісы былі часткова перапісаны ў тэхніцы тэмпернага жывапісу. Неабходнасць аздаблення жывапіснымі сюжэтамі памяшканняў Княжацкай вежы ў пачатку XIV і XV стагоддзяў дастаткова зразумелая з улікам статусу замка як вялікакняскай рэзідэнцыі. Патрэбу ў панаўленні фрэсак у трэці раз адназначна пакуль вытлумачыць складана. Пасля разбурэнняў у другой палове XVII стагоддзя замак больш не ўзнаўляўся і паступова траціў свае ранейшыя функцыі.

Дадзеныя тэхналагічных даследаванняў манументальнага жывапісу Крэўскага замка дазваляюць рабіць выснову, што тэхніка даследаваных роспісаў, падбор пігментаў, структура пафарбовачнага слоя, склад і структура грунтоў дастаткова своеасаблівыя і абсалютна не характэрныя для вядомых твораў візантыйскага жывапісу. Тэхналогія рос-

пісаў у памяшканнях Княжацкай вежы мае значнае падабенства з тэхналагічнымі прынцыпамі жывапісу заходнееўрапейскага сярэднявечча. У той жа час для іх характэрны спецыфічныя рысы і асаблівасці, што магчыма вытлумачыць актыўным пераасэнсаваннем мясцовымі жывапісцамі вопыту і асноў жывапіснай тэхнікі другіх краін.

Матэрыялы даследаванняў Крэўскага замка больш як дзесяцігадовай даўнасці не страцілі свайго актуальнага значэння і для сённяшняга дня. Уважлівы падыход да асэнсавання трох іх чыннікаў – археалагічнага, архітэктурнага і мастацтвазнаўчага, аналіз іх у неразрыўнай еднасці сведчаць пра выключнасць крэўскай фартыфікацыі ў шэрагу аб'ектаў манументальнага дойлідства Беларусі. Перанесеныя ва ўмовы беларускага сярэднявечча замкі-кастэлі, якія служылі крыжакам апорнымі пунктамі ў іх экспансіі на ўсход еўрапейскага кантынента, спазналі істотнае пераасэнсаванне свайго функцыянальнага прызначэння. Нашы продкі ўзводзілі магутныя мураваныя чатырохкутнікі менавіта з мэтай абароны. Гэтай мэце павінна было служыць размяшчэнне беларускіх кастэляў на забалочаным поплаве рэк, што істотна зніжала эфектыўнасць дзеянняў цяжкаўзброеных рыцараў і перашкаджала выкарыстанню тэхнічных прыстасаванняў для разбурэння мұроў. Крэўскі замак быў узведзены пры ўпадзенні рэчкі Шляхцянкі ў Крэвянку. Каля чвэрці замкавай тэрыторыі, яе паўночная частка, знаходзілася на пясчанай дзюне, што ўзвышалася над балоцістым рачным поплавам. Менавіта тут былі выяўлены жылыя і гаспадарчыя пабудовы.

Неўзабаве пасля ўзвядзення мураваных абарончых сценаў на паўночным схіле дзюны была збудавана велічная Княжацкая вежа, характар якой цалкам адпавядае тыпу заходнееўрапейскага данжона. Яе жылыя функцыі пацвярджаюцца не толькі знаходкамі фрагментаў шматлікіх бытавых рэчаў і тынковак з розначасовымі жывапіснымі сюжэтамі, але і звесткамі летапісаў аб падзеях 1382 года, калі ў «твердзы» быў задушаны вялікі князь Кейстут, а зняволены ў «каморы» яго сын Вітаўт здолеў уратавацца бегствам. У замкавую турму, якая раз-

мяшчалася на першым ярусе вежы, можна было трапіць па пераходзе, размешчаным у тоўшчы паўночнай і ўсходняй сцен. Жылыя памяшканні знаходзіліся на трэцім і чацвёртым ярусах. Другі ярус выкарыстоўваўся для гаспадарчых мэтаў. У вежу можна было трапіць праз дзвярны праём, які знаходзіўся на ўзроўні баявой галерэі.

Аналіз выяўленых пры раскопках у Крэўскім замку матэрыялаў, яго архітэктурна-аб'ёмныя характарыстыкі, планіровачная структура ў спалучэнні са звесткамі летапісных крыніц дазваляюць гаварыць пра Княжацкую вежу як пра прататып замкавага палаца.

Узвядзенне вежаў у Крэўскім замку, што было здзейснена неўзабаве пасля будаўніцтва чатырохвугольных у плане абарончых муроў, прыстасаванне адной з іх пад прадстаўнічае жыллё князя сведчыць пра істотныя змены ў характары выкарыстання абарончых збудаванняў гэтага тыпу. Ва ўмовах спецыфікі клімату беларускіх земляў важнае значэнне ў прыўнясенні жылых функцый у мураванае збудаванне меў высокі ўзровень арганізацыі ацяплення памяшканняў з дапамогай кафляных печаў і камінаў, пашырэнне якіх на Беларусі прыпадае менавіта на XIV стагоддзе.